
ЧЫМ УНІКАЛЬНЫ КІНАЛАГІЧНЫ ЦЭНТР УЗБРОЕНЫХ СІЛ? 4-5

ВЫНІКІ ФЕСТЫВАЛЮ «ЛІСТАПАД» 8


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЛІСТАПАДА 2023 г. СУБОТА № 229 (30109)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«У нашых маладых людзей не заўсёды ёсць разуменне, што ўсягo ў жыцці трэба дабівацца сваёй працай. Модна сёння казаць пра сацыяльныя ліфты, але я больш разумею і аддаю перавагу сацыяльнай лесвіцы. Калі чалавек ідзе па гэтай лесвіцы і сам дабіваецца ўсяго. Што датычыцца замацавання маладых спецыялістаў на месцах, мы ўсё больш гаворым пра матэрыяльныя стымулы — зарплата і гэтак далей, але мы ўлічваем маральныя стымулы, калі чалавек недзе служыць і адчувае сувязь не толькі з бацькамі, блізкімі, але і з арганізацыяй, дзе ён працуе».*

# Прадчуванне палёту



Фота БелТА.

У расійскім Цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў імя Гагарына праходзяць трэніроўку беларускія дзяўчаты, адна з якіх у хуткім часе адправіцца ў палёт. На здымку: касманаўт Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ падчас трэніроўкі.

## КОРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 лістапада Указ нумар 373, у адпаведнасці з якім змяняюцца ўмовы кіравання сродкамі сямейнага капіталу, прадугледжаныя Указам нумар 572.**
- Прадоўжана магчымасць бяспошліннага ўвозу электрамабіляў у Беларусь, Арменію, Казахстан і Кыргызстан.
- **Першае пасяджэнне Камісіі па правах чалавека СНД пройдзе 29 лістапада ў Мінску.**
- Беларусь займае першае месца сярод краін — імпарцёраў харчовай прадукцыі ў Расіі.
- **Зімовую падкормку дзікіх жывёл пачалі ў Белавежскай пушчы.**
- Сёлета ў Беларусі адрамантуюць не менш як 3 тысячы кіламетраў дарог.

Фінансавая бяспека

## Не «наКЛІКаць» бы бяды

### Прынамсі, на свае зберажэнні

**Спытайцеся сябе: колькі разоў на дзень вы чуеце ці бачыце папярэджанні аб тэлефонных або інтэрнэт-махлярах? А колькі разоў вы казалі: «Ну як так проста аддаць свае грошы? Я ніколі б не паверыўся на такі прымітыўны развод!» Магчыма і так, але статыстыка няўмольная, і яна сведчыць: ахвярай можа стаць хто заўгодна. Дастаткова толькі аднаго неасцярожнага «кліку» па спасылцы.**

Сапраўды, нягледзячы на намаганні праваахоўных органаў і службаў бяспекі банкаў, справа фінансавага махлярства, асабліва ў сеціве, жывей за ўсіх жывых. Толькі ўявіце, сёлета ўстановы аднаго толькі Беларусбанка правялі больш за тры з паловай тысячы мерапрыемстваў, накіраваных на прафілактыку кіберзлачыннасці. Прычым ільвіная доля прафілактыкі прыпала не на школьнікаў, моладзь і пенсіянераў, а на дарослых, людзей сярэдняга ўзросту — 70 % заходаў датычыліся менавіта іх. Аб чым гэта сведчыць? Толькі аб тым, што залішняя ўпэўненасць у асабістай бяспецы можа выйсці бокам. Сучасныя махляры вельмі вынаходлівыя, а галоўнае — яны хутка мяняюць свае схемы падману. Сёння прапануем вам агляд найбольш распаўсюджаных (і не толькі) махінацый, бо хто інфармаваны — той абаронены.

СТАР. 3

Памяць

## ДАКРАНУЦЦА ДА СКЛАДАНЫХ СТАРОНАК ГІСТОРЫІ ПРАЗ ФАКТЫ

### Генеральная пракуратура і Міністэрства адукацыі прэзентавалі дапаможнік, прысвечаны генацыду беларускага народа

**«Дзеці вайны... Як склалася наша дзяцінства? Ва ўсіх па-рознаму, але ў большасці яно было цяжкім. Асабліва ў яўрэйскіх дзяцей. Калі пачалася вайна, мне было амаль пяць гадоў. Мы жылі ў беларускім мястэчку. Я не памятаю твараў бабулі і дзядулі (іх немцы расстралялі). А маці, старэйшая сястра і я збеглі за дзень да расстрэлу... Хоць было вельмі цёпла, на нас адзелі футра. Я ўзяла любімую ляльку, і мы пайшлі ў лес... Часта адпачывалі, бо я хварэла на коклюш. Зусім абяссілеўшы, пакінула лялькю на пяньку, каб пасля вайны яе забраць... Начавалі на могілках. Але свет не без добрых людзей. Нас прытуліла стогадовая бабуля. У 42-м годзе з'явіліся партызаны, сталі часта прыязджаць карнікі. Атрымаўшы папярэджванне ад разведкі аб іх з'яўленні, мы збегалі ў лес. Па лесе стралялі, свісцелі пулі, а мы хаваліся... Але дзеці ёсць дзеці. Прызвычаіліся да ўсяго: і да свісту пуль, і да трупаў...» — успамінала Зінаіда Гуліш.**

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

